■ На слыху

# ШАЛОМ, «ЕЎРАБАЧАННЕ»!

## Песеннае шоу 2019 года пройдзе ў Іерусаліме

**У ноч з 12 на 13 мая ў сталіцы Партугаліі прайшоў фінальны канцэрт міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2018». Абышоўшы 25 сапернікаў, перамогу атрымала спявачка з Ізраіля Нета Барзілай. Дарэчы, гэты трыумф для Ізраіля стаў першым з 1998 года!**

Зрэшты, інтрыга захоўвалася да апошняга моманту, бо пасля галасавання журы расклад сіл быў іншы: лідзіравала Аўстрыя з 271 балам, Швецыя мела 253, а Ізраіль толькі 212. Усё вырашыла галасаванне гледачоў, паводле якога канкурэнты памяняліся месцамі: Ізраіль, чыя песня «Тоу» набрала ў суме 529 балаў, заняў першую прыступку, Кіпр з 436 баламі — другую, а Аўстрыя з 342 баламі стала трэцяй. Таксама ў дзясятку найлепшых увайшлі Германія (340 балаў), Італія (308), Чэхія (281), Швецыя (274), Эстонія (245), Данія (226) і Малдова (209). Наш былы суайчыннік Аляксандр Рыбак, які прадстаўляў Нарвегію, заняў у выніку 15-е месца, а спявак з Украіны Меловін стаў 17-м.

Такім чынам, спраўдзіліся ўсё ж першапачатковыя прагнозы букмекерскіх кантор, якія яшчэ да пачатку конкурсу прадракалі Ізраілю перамогу, а Беларусі нявыхад у фінал.

Дарэчы, па традыцыі пасля завяршэння грандфіналу на афіцыйным сайце eurovision.tv былі апублікаваныя дэталёвыя лічбы галасавання нацыянальных журы і гледачоў ва ўсіх краінах — удзельніцах «Еўрабачання». І цяпер мы ведаем, напрыклад, якія ацэнкі выставіла беларускае журы, у якое ўваходзілі спявак Алекс Набееў з гурта «Атлантыка», прадстаўнік Міністэрства культуры Таццяна Пархамовіч, спявачка Іскуі Абалян, тэле- і радыёвядучы Уладзімір Богдан і музычны прадзюсар маладых талентаў Святлана Стацэнка. Дык вось, у фінале балы ад журы дасталіся Кіпру (12), Аўстрыі (10), Нарвегіі (8), Албаніі (7), Чэхіі (6), Літве (5), Славеніі (4), Даніі (3), Аўстраліі (2) і Швецыі (1). А гледачы падтрымалі найперш «сваіх» — Украіну (12), Нарвегію (10), а потым Ізраіль (8), Данію (7), Малдову (6), Чэхію (5), Італію (4), Кіпр (3), Венгрыю (2) і Балгарыю (1). Як бачым, ацэнкі часам дыяметральна процілеглыя.

А што з выступленнем прадстаўніка Беларусі, украінскага спевака Мікіты Аляксеева? У сваім паўфінале ALEKSEEV набраў 65 балаў і стаў усяго толькі 16-м з 19 удзельнікаў. Баламі яго нумар з ружай адзначылі журы Азербайджана (12), Албаніі (7) і Арменіі (1), а таксама гледачы Азербайджана (12), Арменіі (10), Эстоніі і Літвы (па 6), Кіпра (5), Фінляндыі (3), Балгарыі (2) і Грэцыі (1). Словам, конкурс для маладога артыста скончыўся яшчэ напачатку.



«Першае, што я буду рабіць пасля вяртання ў Ізраіль? Хумус!» — пажартавала Нета Барзілай. Дарэчы, кампанію на сцэне ёй складалі не толькі тры дзяўчыны-танцоркі, але і 112 цацачных кацянят манэкі-нэко, якія лічацца сімваламі ўдачы.



«Гарачыя танцы» прадстаўніцы Кіпра Элені Фурэйра спадабаліся гледачам, і артыстка лідзіравала да апошніх секундаў галасавання, але ў выніку спынілася за крок ад п'едэстала.



Фота eurovision.tv.

Пранкер-хуліган, які выскачыў з залы на сцэну і адабраў у брытанскай спявачкі SuRie мікрафон, ледзь не сарваў яе выступленне, але ахова адрэагавала аператыўна. Дэлегацыя Вялікабрытаніі адмовілася ад прапановы арганізатараўераспяваць наноў, адзначыўшы, што ганарыцца выступленнем.

Ягоны прадзюсар Алег Баднарчук выказаў у сацсетках падзяку прыхільнікам «за падтрымку ў любым выглядзе». «Удзел у Еўрабачанні — гэта скончыць тры інстытуты адразу і хутка, гэта вельмі добрая адукацыя перадусім у арганізацыі ўнутры і звонку сябе. Я вельмі ўдзячны лёсу, што гэты дыплом у кішэні ў нашай каманды», — напісаў прадзюсар, які адзначыў таксама, што яго падапечны правяраў сябе на зусім незнаёмай публіцы, узмоцнена вучыў англійскую і займаўся вакалам 24 гадзіны на суткі. Аднак, што адметна, ніводнага слова падзякі ў адрас Беларусі, якая ўласна і дала артысту саму магчымасць удзелу ў «Еўрабачанні», у гэтым адкрытым звароце няма... У адрозненне ад самога Мікіты Аляксеева, які падзякаваў камандзе Белтэлерадыёкампаніі.

...А вось 25-гадовая Нета Барзілай, дзякуючы якой Ізраіль атрымаў чацвёртую перамогу ў «Еўрабачанні», здаецца, не забыла нікога. І скрозь слёзы шчасця, прыціскаючы да грудзей выйграны крышталёвы мікрафон, звярталася да ўсіх гледачоў: «Дзякуй, што выбралі незвычайнае, што выбралі смеласць!». Смеласці афіцэру ваенна-марскога флоту Ізраіля сапраўды не пазычаць — гучна заявіць аб праве заставацца самім сабой, нягледзячы ні на якія стандарты, можа далёка не кожны. Уласна, песня «Тоу», якая цалкам можа стаць неафіцыйным гімнам руху феміністак, якраз і заклікае не быць цацкай у чужых руках. Прынамсі, выбар шматмільённай тэлеаўдыторыі «Еўрабачання» на сёння такі. Да сустрэчы ў Іерусаліме, «Еўрабачанне-2019»!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# Спадчына народнага паэта, адрасаваная дзецям




**У выдавецтве «Кнігазбор» у серыі «Кнігарня пісьменніка», заснаванай Саюзам беларускіх пісьменнікаў, пабачыла свет кніга вершаў народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна «Азбука. Вясёлы вулей».**

Ужо болей за чатыры гады назад пайшоў з жыцця майстар беларускага верша, таленавіты мастак слова, а кнігі яго і зараз прыходзяць да чытача. Відаць, у гэтым і заключаецца неўміручасць сапраўднага мастацтва — калі дыялог з чытачом, гледачом вядзецца незалежна ад нейкіх штучных намаганняў. Адным словам, жыццё Рыгора Барадуліна ў літаратуры прадаўжаецца. Калі быць дакладнымі, то кніга яго твораў, адрасаваных дзецям, выйшла ў падсерыі «Каляровы ровар». Наклад па сённяшнім часе досыць прыстойны — 1000 экзэмпляраў. Ілюстрацыі да зборніка зрабіла Лізавета Лянкевіч.

Можна нават знаёмства з кнігай раскласці на дзве часткі: першая — чытанне бацькамі для дзяцей ці чытанне самімі дзецьмі, а другая — разгляданне малюнкаў, якія мне асабіста падаюцца надзвычай красамоўнымі і істотна пашыраюць прастору тэкстаў, уплываюць на іх засваенне.

«Вулей ёсць // такі вясёлы, // пчолы // з гэтага вулля // прывядуць цябе // да школы...» Лепшага пачатку і не прыдумаеш! Адразу разумееш, чаму паэт пайшоў па шляху такога параўнання: азбука — вулей. Літары — пчолы. Чытаем ад паэта-настаўніка Рыгора Барадуліна: «Літары // ад А да Я — // пчолак дружная сям'я // носіць мёд у соты ведаў, // просіць, каб усё ты ведаў...» Прыдумак у паэта-штукара хапае. Непаседлівыя літары вядуць у кнізе сваё жыццё: **Д** дрэсіруе дога, **Ё**рш... саграває лёд, **Ж** апякуецца жнівом, перавязвае жытні сноп і яшчэ шмат што робіць. **З** зубрам блукае ў пушчанскай завеі. Чытаць кароткія, лаканічныя мініяцюры, паядналыя адным клопатам, — суцэльнае задавальненне, сапраўдная асалода судакранання з роднай мовай, роднымі словамі.

Вось дзе пераконваешся, што кніга з'яўляецца падарункам. Гэтым разам — падарункам бацькоў дзецям, якія яшчэ толькі-толькі пачынаюць жыць клопатам чытання.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

■ Фестывалім

# Лялькі, цікавыя і дарослым

**X Міжнародны фестываль тэатраў лялек запрашае гледачоў наведаць цікавыя пастаноўкі ўжо зусім хутка — з 18 да 21 мая! Арганізатарамі гэтай дзеі з'яўляюцца Міністэрства культуры Беларусі, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт і Беларускі дзяржаўны тэатр лялек.**

Маштабны форум, які праходзіць раз у два гады, адкрые свае дзверы ўсім, хто шануе сапраўднае тэатральнае мастацтва і не баіцца эксперыментаў. За 4 дні мінчане і госці сталіцы ўбачаць 14 спектакляў з 7 краін свету. Упершыню на фестывалі будуць прадстаўлены калектывы з Ірана, Балгарыі, Іспаніі. Падзяліцца сваёй творчасцю прыедуць найлепшыя тэатральныя кампаніі Францыі, Ізраіля, Расіі і ўсе дзяржаўныя тэатры лялек Беларусі. Нагадаем, што за папярэднія фестывалі Мінск наведала больш за 60 тэатраў з розных куткоў свету!

Юбілейны фестываль абяцае здзівіць не толькі шырынёй геаграфіі краін-удзельніц, але і ўзроставай скіраванасцю спектакляў: большасць пастановак адрасаваныя дарослай аўдыторыі. Традыцыйна арганізатары фестывалю фарміруюць праграму так, каб у гледачоў была магчымасць убачыць не толькі новыя і ўжо высока адзначаныя спецыялістамі спектаклі, але і ў поўнай меры адчуць усю жанравую разнастайнасць сучаснага тэатра лялек. Прадстаўленыя спектаклі сёлетняй праграмы — гэта смелае спалучэнне харэаграфіі, пантамімы і класічных фармаў тэатра.



Распачнецца фестываль спектаклем «Новая зямля» Брэсцкага тэатра лялек, створаным па аднайменным творы Якуба Коласа.

Асабліва яркай абяцае быць беларуская праграма форуму. Айчынныя калектывы прывязуць самыя свежыя работы, створаныя на мяжы традыцый і эксперымента. Дзіцячая праграма фестывалю будзе прадстаўлена кранальнымі пастаноўкамі з Ізраіля («кравец», The Train Theater) і Віцебска («Умка», Беларускі тэатр «Лялька»).

Традыцыйна падчас фэсту будуць праводзіцца майстар-класы і дыскусіі з гледачамі і крытыкамі. Таксама ўсіх чакае ўнікальны вечар тэатральнай музыкі ад гурта «Нагуаль». Музыкі рыхтуюць абноўленую праграму з кампазіцый, напісаных спецыяльна для тэатраў лялек.

Спектаклі форуму пройдуць на пяці пляцоўках горада — Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, Новага драматычнага тэатра, Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, а таксама на Малой сцэне Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра і Камернай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**